# Навучальныя гурткі

## як новы падыход да грамадзянскай адукацыі ў Беларусі

**Уладзімір Роўда**

**Уладзімір Роўда** — дырэктар Рэсурснай праграмы навучальных гурткоў у Беларусі.

## Роля грамадзянскай адукацыі ў пераходзе да дэмакратыі

Кожнае грамадства, якое выбірае шлях дэмакратычных трансфармацый, адчувае патрэбу ў трансфармацыі палітычнай культуры — іншымі словамі, яму патрэбны мэтанакіраваныя змены ў ведах, навыках, адносінах, каштоўнасных арыентацыях і мадэлях паводзінаў грамадзянаў. Без гэтага дэмакратычна арыентаваным палітычным інстытутам пагражае магчымасць аказацца ў варожым сацыяльным асяроддзі і нават атрымаць ад народа вотум недаверу.

Таму ў большасці так званых пераходных дзяржаў урады надаюць асаблівую ўвагу працэсам сацыялізацыі і рэсацыялізацыі грамадзянаў, каб пераадолець гэты небяспечны бар'ер паміж дэмакратычнымі палітычнымі інстытутамі і недэмакратычнай палітычнай культурай насельніцтва. У гэтым працэсе ключавую ролю адыгрывае **грамадзянская адукацыя**.

Грамадзянская адукацыя ў шырокім сэнсе — гэта сістэма адукацыі людзей, накіраваная на навучанне іх жыццю і дзеянням ва ўмовах дэмакратычнай палітычнай сістэмы і рынкавай эканомікі. Яна мае мэтамі перадачу ведаў пра грамадства, дапамогу людзям ў фармаванні незалежнай грамадзянскай пазіцыі, а таксама прасоўванне і развіццё навыкаў адказнага ўдзелу ў палітычным і сацыяльным жыцці.

Менавіта грамадзянская адукацыя адыграла значную ролю ў пераходзе да дэмакратыі Федэральнай рэспублікі Германія ў 40-50-я гады мінулага стагоддзя, а таксама ўсходненямецкіх земляў у 90-я. У ЗША, Канадзе, Аўстраліі і Ізраілі яна дапамагала і дапамагае імігрантам адаптавацца да дэмакратычных каштоўнасцяў і нормаў. Акрамя таго, у Скандынавіі, Францыі або Вялікабрытаніі сыстэма навучання грамадзянаў дэмакратычным каштоўнасцям паўплывала на ўзрастанне ўзроўню адказнага палітычнага ўдзелу. Нарэшце, у шмат якіх краінах Усходняй Еўропы і былога СССР грамадзянская адукацыя дамагае ўладам у вырашэнні вельмі цяжкай задачы: трансфармацыі палітычнай і эканамічнай сістэмаў пры захаванні адноснай палітычнай стабільнасці.

## Асаблівасці грамадзянскай адукацыі ў Беларусі

Беларусь мае свае, даўно вядомыя і апісаныя асаблівасці развіцця грамадзянскай адукацыі.

Калі коратка прыгадаць іх, то першае адрозненне нашай краіны ад шматлікіх еўрапейскіх суседзяў, — тое, што грамадзянскай адукацыяй у нас займаецца не дзяржава, але энтузіясты з ліку недзяржаўнага сектару.

Другая асаблівасць заключаецца ў тым, што беларускім арганізацыям, якія працуюць у сферы грамадзянскай адукацыі, прыходзіцца ахопліваць больш тэмаў, чым іх калегам у краінах-суседзях. Да прыкладу: узнаўляць нацыянальную свядомасць беларусаў, навучаць людзей сапраўднай гісторыі краіны і ўвогуле прыўносіць дух патрыятызму ў сваю дзейнасць. Гэта неабходна таму, што на дзяржаўным узроўні развіццё адукацыі і культуры тытульнай нацыі амаль не падтрымліваецца.

Нарэшце, па-трэцяе, унутраныя фінансавыя магчымасці для рэалізацыі праграм грамадзянскай адукацыі вельмі абмежаваныя. Дзяржава не толькі не спрыяе ім, але часта і ўзводзіць бар'еры на шляху іх ажыццяўлення. Прыватны бізнэс таксама дыстанцыюецца ад НДА — часткова з-за сваёй слабасці, часткова — з-за боязі быць пакараным дзяржавай. Таму ў сваёй дзейнасці арганізацыі звычайна абапіраюцца або на ўласныя рэсурсы, або, што здараецца часцей, на сродкі замежных донараў.

## Навошта нам патрэбны навучальныя гурткі?

У пошуках найбольш аптымальных формаў працы з насельніцтвам беларускія арганізацыі грамадзянскай адукацыі (АГА) актыўна вывучаюць замежны досвед. Менавіта дзякуючы гэтаму адбылося знаёмства АГА з шведскім вопытам грамадзянскай адукацыі, які рэалізуецца шляхам арганізацыі так званых "навучальных гурткоў" (study circles). Навучальныя гурткі — гэта асаблівая форма адукацыі дарослых, якая выкарыстоўваецца ў Швецыі дзяржавай для развіцця грамадзянскай супольнасці.

Знаёмства беларускіх арганізацый, якія займаюцца грамадзянскай адукацыяй, з метадам навучальнага гуртка ў межах супрацоўніцтва з адной з вядучых шведскіх арганізацый у сферы навучання дарослых — Studieförbundet Vuxenskolan — дазволіла "прымерыць" шведскі вопыт у гэтай сферы на Беларусь. Для гэтага быў шэраг падстаў.

Перш за ўсё тое, што выкарыстанне гэтага метаду дазваляе зламаць штучныя бар'еры, якія існуюць паміж насельніцтвам і прадэмакратычнымі сіламі. Прычыны для ўзнікнення такіх бар'ераў розныя. З аднаго боку, як узгадвалася раней, іх будуюць улады, якія ў большасці не зацікаўлены ў дэмакратызацыі грамадства. Але дапамагаюць стварэнню бар'ераў і самі арганізацыі, якія ўсё часцей вырашаюць, што ім больш зручна працаваць з аднадумцамі, а не прыцягваць да сябе неангажаванае насельніцтва.

→

Навучальныя ж гурткі могуць рушыць такія перашкоды таму, што з'яўляюцца адукацыйнымі ініцыятывамі самых розных катэгорыяў насельніцтва — студэнтаў, пенсіянераў, маладых бацькоў і г.д. — якія вырашаюць самастойна арганізавацца для атрымання дадатковых ведаў і занямання вольнага часу. Выкарыстанне гэтага метаду дазваляе адукацыйным арганізацыям базаваць сваю дзейнасць на ініцыятыве "знізу", задавальняць патрэбы самых розных мэтавых групаў у адукацыйных паслугах, а таксама будаваць сапраўднае партнёрства паміж рознага кшталту адукацыйнымі структурамі і грамадзянамі.

У той жа час навучальныя гурткі могуць быць выкарыстаныя і для стварэння новых недзяржаўных арганізацый або прыцягнення ў дэмакратычныя рухі новых актывістаў, якія маглі б унесці ва ўжо існуючыя ініцыятывы новыя, свежыя ідэі.

Яшчэ адна перавага навучальных гурткоў перад традыцыйнымі для "трэцяга сектару" формамі адукацыі (семінары, курсы, школы і г.д.) — у тым, што яны не патрабуюць ні афіцыйнай рэгістрацыі, ні прыцягнення для іх арганізацыі вялікай колькасці людзей або значных фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў. У сучаснай Беларусі, дзе ўсё часцей закрываюцца недзяржаўныя арганізацыі, навучальныя гурткі, удзельнікі якіх могуць рэгулярна сустракацца ў прыватных кватэрах і без ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, даюць магчымасць адукацыйным арганізацыям не проста працягваць працаваць, але нават рабіць сваю працу больш эфектыўнай.



Акрамя таго, незалежна ад тэмы навучальныя гурткі могуць стаць сапраўднай школай дэмакратыі для Беларусі, бо яны адмаўляюць аўтарытарнаму стылю навучання, але затое прадугледжваюць актыўныя формы ўдзелу, свабодны абмен думкамі, дыскусіі, выбар тэмаў для абмеркавання і супольнае стварэнне навучальных матэрыялаў лідэрам і ўдзельнікамі гуртка. Як паказвае шведскі досвед і першыя вынікі беларускай практыкі, у навучальных гуртках ствараецца мікрамадэль дэмакратычнай супольнасці, дзе і лідэр, і ўдзельнікі працуюць па сфармуляваных імі разам "правілах гульні".

## Першы досвед беларускіх навучальных гурткоў

З 2003 года ў Беларусі намаганнямі арганізацый грамадзянскай адукацыі быў рэалізаваны шэраг праектаў па распаўсюджванні метаду навучальных гурткоў. Пасля агульнага знаёмства з метадам, вясной 2004 года былі праведзены першыя навучальныя гурткі і семінары для лідэраў навучальных гурткоў намаганнямі дзесяці арганізацый з ліку АГА:

- **ГА "Адукацыйны цэнтар «ПОСТ»" (Мінск)**
- **ГА "Жаночы незалежны дэмакратычны рух" (Мінск)**
- **ГА "Фонд «Адкрытае грамадства»" (Мінск)**
- **ГА "Фонд ім. Льва Сапегі" (Мінск)**
- **ГА "Цэнтр сацыяльных інавацый" (Мінск)**
- **ГА "Цэнтар Супольнасць" (Мінск)**
- **ГА "Экадом" (Мінск)**
- **ГАГАМН "ВІТ" (Гродна)**
- **Інфармацыйна-аналітычны цэнтр НДА пры МГА "ЗБС «Бацькаўшчына»" (Мінск)**
- **СПГА "Чазенія" (Заслаўе).**

Усяго да канца года імі было праведзена каля 100 гурткоў, у якіх прынялі ўдзел звыш тысячы асобаў, а таксама падрыхтавана 139 лідэраў. Тэмы для гурткоў былі разнастайнымі: ад вывучэння замежных моў да абмену досведам маладых маці, ад вывучэння палітычных ідэалогій да асноваў псіхалогіі.

У працэсе дзейнасці да арганізацый далучыліся таксама ГГГА "Сацыяльныя праекты" (Гомель), ГА "Фокус-група" (Мінск), ГА "Хрысціянская сяброўства дарослых і маладых" — УМСА (Ліда), МГА "Адукацыя без межаў" (Фаніпаль).

Беларускі досвед аказаўся настолькі карысным, што пасля завяршэння пілотнай фазы распаўсюджвання метаду арганізацыі грамадзянскай адукацыі вырашылі пры дапамозе шведскіх партнёраў стварыць Рэсурсную праграму навучальных гурткоў. Мэта Рэсурснай праграмы, якая пачала працу ў студзені 2005 года, — з аднаго боку, падтрымка ўжо існуючых навучальных гурткоў, з другога — папулярызацыя ідэі навучальных гурткоў сярод НДА і неангажаванага насельніцтва Беларусі.

За шэсць месяцаў працы праграмы было праведзена чатыры прэзентацыі метаду навучальнага гуртка ў чатырох гарадах Беларусі — Віцебску, Глыбокім, Лідзе і Пінску, а таксама два семінары для новых і адзін — для дасведчаных лідэраў навучальных гурткоў. Акрамя таго, быў перавыдадзены распрацаваны раней дапаможнік "Навучальны гурток: ад тэорыі да практыкі", а таксама выдадзены інфармацыйны буклет, у якім пададзены асноўныя звесткі пра метад навучальнага гуртка, магчымыя тэмы гурткоў, арганізацыі, якія выкарыстоўваюць гэты метад і саму праграму.

Першыя вынікі дзейнасці Рэсурснай праграмы паказваюць вялікі ўзровень зацікаўленасці самых розных катэгорый насельніцтва ў выкарыстанні навучальных гурткоў як у прафесійнай дзейнасці, так і ў штодзённым жыцці.

Сярод лідэраў і ўдзельнікаў гурткоў — прадстаўнікі самых розных прафесій і груп: настаўнікі, псіхолагі, эколагі, медыкі... Прычым як актывісты недзяржаўных арганізацый, так і людзі, якія дагэтуль ніколі не прымалі актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Разнастайнасць тэмаў гурткоў паказвае, што гэты метад універсальна падыходзіць для самых розных сфер грамадскай актыўнасці і дадатковай адукацыі дарослых.

У той жа час трэба адзначыць і важны ўплыў ужывання метаду навучальнага гуртка на развіццё беларускай грамадзянскай супольнасці. Розныя аспекты грамадзянскай адукацыі — ад базавых ведаў па абароне правоў жыхароў лакальнай супольнасці да абмеркавання варыянтаў далейшага палітычнага развіцця Беларусі — былі папулярнымі сярод студэнтаў, настаўнікаў гісторыі, а таксама звычайных жыхароў гарадоў і мястэчак Беларусі.

Можна спадзявацца, што тэматычныя навучальныя гурткі па меры пашырэння метаду будуць усё больш спрыяць фармаванню ў беларускага насельніцтва больш актыўнай грамадзянскай пазіцыі. І нават калі ў навучальных гуртках будуць вывучацца на першы погляд далёкія ад дэмакратыі пытанні кшталту рукадзелля альбо арганізацыі дачнага ўчастка, сама атмасфера правядзення гуртка, прасякнутая роўнасцю і актыўным удзелам, эфектыўна рыхтуе беларусаў да актыўнага ўдзелу ў будучай дэмакратычнай трансфармацыі краіны.

**Больш падрабязна пра навучальныя гурткі можна даведацца на старонцы Рэсурнай праграмы па адрасе: http://ace.ngo.by/hurtki.**

■